**Латыши и белорусы: вместе сквозь века.** – 2019. – Вып. 8. – С. 17−24.

***ИСТОРИЯ***

# ХРАПАВІЦКАЯ ЛАТЫШСКАЯ КАЛОНІЯ

## Latvian colony Khrapavichy

**М. Каралёў (M. Karaliou),**
Віцебскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт
*г. Віцебск, Беларусь*

Статья посвящена рассмотрению положения Храповичской латышской колонии от момента её появления в последней трети XIX в. до фактического исчезновения в конце 1930-х гг. Автор описывает социально-экономическое и культурное развитие колонии на фоне изменяющихся политических условий.

*Ключевые слова*: Храповичи, латыши, БССР, латышская школа, хутор, репрессии.

The article is devoted to the consideration of the position of the Hrapovichi Latvian colony from the moment of its appearance in the last third of the XIX century till the actual disappearance in the late 1930s. The author describes the social, economic and cultural development of the colony against the background of changing political conditions.

*Keywords*: Khrapavichy, Latvians, BSSR, Latvian school, farm, repression.

Стан сучаснай беларускай вёскі даволі сумны. Калі едзеш праз іх, то бачыш, як з кожным годам павялічваецца колькасць незаселеных хат, а некалі апрацаваныя абшары зарастаюць пустазеллем і хмызом. І часам бывае даволі складана сабе ўявіць, што некалі ў гэтых мясцінах віравала жыццё і людзі змагаліся за кожны кавалачак зямлі.

Супярэчлівая палітыка савецкай улады прывяла да поўнага занятаду сялянскага жыцця. Аднак яшчэ сто гадоў таму яно было магутным. У ваколіцах Віцебска на зямлі побач працавалі беларусы, палякі, латышы, літоўцы, немцы і інш. Усе яны дапамагалі адзін аднаму і рабілі свой унёсак у развіццё сельскай гаспадаркі. Разуменне беларускай гісторыі немагчыма без уліку ўплываў культур розных нацыянальнасцяў, якія жылі разам на беларускай зямлі.

Прадстаўнікі нацыянальных меншасцяў звычайна сяліліся побач, утвараючы так званыя "калоніі". Непадалёк ад Віцебска, на тэрыторыі сучаснага Мазалаўскага сельсавета існавала немалая латышская калонія ў раёне вёскі Храпавічы. Гэтай калоніі і прысвечаны дадзены артыкул.

Прысутнасць латышоў на беларускіх землях стала відавочнай пасля адмены ў Расійскай імперыі прыгоннага права. З аднаго боку, тут прычыніліся наступствы паўстання К. Каліноўскага 1863−1864 гг., але галоўнае – розніца ў кошце зямлі ў прыбалтыйскіх і беларускіх губернiях. Многія землеўладальнікі былі зацікаўленыя ў продажы ці доўгатэрміновай арэндзе сваёй землі (тут трэба заўважыць, што пэўная частка памешчыкаў атрымалі ўладанні пасля задушэння паўстання і не былі інтэграваны ў існуючыя гаспадарчыя адносіны). Беларускія сяляне ў пераважнай большасці не мелі сродкаў для выкупу, а таму памешчыкі пачалі актыўна даваць абвескі ў рыжскіх газетах (у Курляндскай і Ліфляндскай губерніях, дзе сярод землеўладальнікаў пераважалі немцы, таварна-грашовыя адносіны былі развіты значна больш). У выніку таксама значнай сельскай перанаселенасці ў прыбалтыйскіх губерніях латышы-сяляне ў 1860−80-х гг. пачалі актыўна перасяляцца ў іншыя месцы імперыі. Даследчык міграцый латышоў другой паловы XIX ст. Т. Кікутс адзначае, што сярод канчатковых мэтаў перасяленцаў Віцебская губернія (за выключэннем так званых "латышскіх уездаў" – Дзвінскага, Рэжыцкага і Люцынскага) займала трэцяе месца, саступаючы толькі Ковенскай і Пскоўскай [1]. У гэты ж час з'явіліся латышы і ў ваколіцах Храпавічаў. К. Шкільтэр, гісторык, супрацоўнік латышскага сектара Акадэміі навук БССР, падае 1868 г. як год заснавання Храпавіцкай латышскай калоніі [2]. Па іншым дадзеным яна была ўтворана ў 1880 г. [3]. Першапачаткова тут пасялілася 6 сямей, якія падзялілі 300 дзесяцін зямлі [3]. Гэтых людзей адразу ў

ваколіцах пачалі лічыць багатымі, бо яны набылі зямлю ва ўласнасць нават без пазыкі пазямельнага банка. На працягу 1880-х гг. сюды перасялілася яшчэ некалькі сямей. Трэба адзначыць, што гэта былі сяляне з Ліфляндскай губерніі як лютэранскага, так і праваслаўнага веравызнання. Прычым для апошніх у 1890-х гг. пачалі служыць набажэнствы ў царкве на латышскай мове. Гэтаму спрыяў тагачасны епіскап Віцебскі Аляксандр Закіс, латыш па паходжанні.

Трэба адзначыць, што латышы ўжо тады прытрымліваліся хутарской сістэмы гаспадарання (пазней, у 1906–1907 гг. яе ўвядзенне стане адной з галоўных мэт аграрнай рэформы П. Сталыпіна). Таму Храпавіцкая латышская калонія (як і многія іншыя) не была вёскай у звычайным разуменні. Яе утваралі маёнтак Храпавічы, Пуцілава, фальварак Фёдарава, Талынава і некалькі іншых. У першыя гады савецкай улады такая расселенасць стала нечаканасцю для бальшавіцкіх агітатараў, якія прыязджалі для правядзення сялянскіх сходаў і сутыкаліся з праблемай, што каб абысці ўсе гаспадаркі і запрасіць людзей, трэба было выдаткаваць некалькі гадзін. І сёння месцамі на аддаленні адзін ад аднаго можна сустрэць рэшкі каменных гаспадарчых пабудоў латышоў.

У працах А.П. Сапунова маюцца звесткі, што на 1906 г. былы маёнтак Вялікія Храпавічы налічваў 8 фальваркаў (253 дзесяціны зямлі і 110 жыхароў), якія належалі лютэранам Канкілю, Лацы, Цыбанду і Гобе; маёнтак Малыя Храпавічы налічваў 4 фальваркі (272 дзесяціны і 68 жыхароў), якія належалі праваслаўным Подзіпу, Крампу, Зарыну і Шнэлю [14, с. 39]. З ваколіц, ф. Фёдараўка належаў Балціну, ф. Крукава – Юргенсону (абодва лютэране), ф. Каменка – Азолу (праваслаўны) і г.д. [14, с. 39–40]. Такім чынам, можна бачыць, што тут сярод латышоў было пэўнае размежаванне па рэлігійнай прыкмеце.

Прыход латышоў на беларускія землі станоўча адбіўся на развіцці культуры землекарыстання. Латышы атрымалі ў надзел многа няўдобіц, якія пачалі распрацоўваць. Яны практыкавалі пяці-, шасціпольны севазварот, актыўна выкарыстоўвалі сельскагаспадарчыя машыны, многія з якіх замаўлялі ў прыбалтыйскіх губернях. Латышы трымалі звычайна не менш за 2 каровы. Амаль не было гаспадарак, у якіх не было б каня. Таму заўсёды пэўная частка зямлі адводзілася пад лугі. Пры магчымасці (асабліва падчас сенакосу, жніва і чысткі льну) латышы наймалі сельскагаспадарчых рабочых з ліку беларусаў. Плацілі добра. Аднак не ўсе мясцовыя селяне з ахвотай найміліся да іх. Як адзначае даследчык латышоў на Беларусі У.В. Тугай, прычынай была адсутнасць звычкі да інтэнсіўнага тэмпу працы, што задаваў латыш-гаспадар, які сам заўсёды станавіўся і працаваў побач [4]. У выніку, латышскія гаспадаркі на фоне

суседніх беларускіх вельмі хутка пачалі выглядаць больш моцнымі. Пры гэтым многія беларусы сталі пераймаць у латышоў метады гаспадарання, што прывяло да інтэнсіфікацыі вытворчасці і ў іх сядзібах. Некаторыя з іх далучыліся да Храпавіцкай латышскай калоніі.

Як цікавы факт, можна падаць сведчанні мясцовых жыхароў, якія апавялі нам падчас экспедыцыі ў ліпені 2015 г. расказанае іх бацькамі, што латышы прывезлі з сабой і пасадзілі некалькі гатункаў дрэў, якіх ні тут, ні ў ваколіцах ніколі не расло. Гэта цалкам верагодна, бо падцвярджаецца сведчаннямі і з іншых месцаў. Чужая зямля ёсць чужая зямля, але пасаджаныя на ёй расліны дапамагалі латышам адчуваць лучнасць з радзімай.

Усталяванне савецкай улады латышы сустрэлі без якога-небудзь энтузіязму. Яны ўжо выкупілі сваю зямлю ва ўласнасць і ніякай палёгкі ў гэтым сэнсе бальшавіцкі пераварот ім не нёс. Наадварот, харчразвёрстка, якую ва ўмовах ваеннага камунізму ўвялі бальшавікі, амаль цалкам вычышчала запасы (у тым ліку пасяўны матэрыял), што паставіла многія гаспадаркі на мяжу галечы. Не трэба казаць, што метады яе правядзення мала чым адрозніваліся ад узброенага рабавання.

Але пераход да нэпа, замена харчразвёрскі на фіксіраваны харчпадатак далі магчымасць сялянам аднавіць сельскагаспадарчую вытворчасць. Аднак спакойным жыццё не стала. Абвешчанае землеўпарадкаванне вымагала драблення буйных гаспадарак, адрэзак лепшых кавалкаў зямлі, што негатыўна паўплывала на стан гаспадарання. Адначасова на гэтай эканамічнай глебе ўзмацніўся міжнацыянальны антаганізм паміж больш заможнымі латышамі і беднякамі з ліку беларусаў і рускіх, на карысць якіх узгаданыя абрэзкі зямлі і рабіліся [5]. Гэты аспект быў, тым не менш, адзіным выпадкам сярод дабрасуседскіх адносін беларусаў і латышоў.

Зрабіць дасканалыя высновы наконт дынамікі насельніцтва Храпавіцкай латышскай калоніі даволі складана з тых крыніц, якімі мы валодаем. Перапіс насельніцтва 1926 г. зафіксаваў тут 76 гаспадарак. К. Шкільтэр адзначаў, што непасрэдна латышскіх было 10 (па стану на 1928 г.) [2], але нельга сказаць дакладна, ці ўлічваў ён вакольныя латышскія хутары, якія разам з Храпавічамі ўтваралі калонію.

Культурнае жыццё ў Храпавіцкай латышскай калоніі развівалася сваім чынам і даволі актыўна. Гэта не дзіўна, бо латышы заўсёды былі вядомыя сваёй музыкальнасцю і імкненнем да спеваў і танцаў. Прыкладна ў 1885 г. латышы з Храпавічаў і Пуцілава стварылі хор (дырыжор Віттэрунг), які спяваў у Віцебскай лютэранскай кірсе ў 1880–90-х гг., а таксама даў некалькі канцэртаў [3]. Яшчэ да 1917 г. тут

дзейнічала культурна-асветніцкае таварыства, пры якім працавалі драматычны і харавы гурткі (апошні, між іншым, налічваў 40 пеўчых). Калі казаць пра рэпертуар, то, напрыклад, у 1920 г. Храпавіцкая драматычная студыя прадставіла 9 п'ес на латышскай мове і 4 на рускай. Сярод аўтараў былі А. Астроўскі, Г. Гаўптман, Г. Ібсен, А. Чэхаў, шэраг латышскіх драматургаў. Наведвалі пастаноўкі сяляне з бліжэйшых латышскіх калоній і беларускіх вёсак, пераважна моладзь [6]. Аднак ужо ў першай палове 1920-х гг. дзейнасць усіх культурна-асветніцкіх гурткоў пачала трапляць пад пільны кантроль партыйных органаў (палітасветы і агітпропа). Савецкія ўлады імкнуліся надаць ім "правільны" ідэалагічны ўхіл. Падчас перарэгістрацыі на падставе адзінага Статута для ўсіх культурна-асветніцкіх гурткоў асаблівая ўвага надавалася сацыяльнаму складу членаў і зместу дзейнасці гурткоў. Пачалася "чыстка" драматычнага рэпертуара, былі аб'яўлены кампаніі па барацьбе з танцамі, якія называліся пустым марнаваннем часу. Усё гэта, як адзначыла Г.М. Якаўлева, сведчыла пра паступовае выцясненне грамадскай ініцыятывы і культурнай адметнасці [6]. У 1924 г. Храпавіцкі культурна-асветніцкі гурток налічваў 36 членаў. Пры ім дзейнічалі драматычная студыя і бібліятэка [7]. Але яго значэнне як культурнага цэнтра пачало падаць.

Працавала ў Храпавічах і школа, якая ўжо дакладна існавала ў пачатку XX ст. Увогуле латышы адзначаліся высокім узроўнем адукацыі, большасць выпісвала газеты ці часопісы. Згодна перапісу 1897 г. сярод дарослых латышоў (старэйшых за 20 гадоў), што жылі ў Віцебскай (за выключэннем "латышскіх уездаў"), Магілёўскай і Мінскай губернях, пісьменнымі былі каля 65% мужчын і 62% жанчын, тады як сярэдні паказчык пісьменнасці па гэтым губерням быў адпаведна 26% і 9% [8]. Сярод латышоў моцнай была традыцыя хатняй адукацыі, якую яны прынеслі і на Беларусь. Дзякуючы ёй, атрымоўвалася захоўваць сваю мову і нацыянальныя адметнасці.

У 1920/21 навучальным годзе ў Храпавіцкай латышскай школе навучалася 18 хлопчыкаў і 18 дзяўчат [9]. Слабое фінансаванне ў першыя паваенныя гады было адной з галоўных праблем. Не хапала падручнікаў на латышскай мове (да 1924 г. іх амаль увогуле не было), існавала праблема з настаўніцкімі кадрамі. Калі спачатку школам дазвалялася заключаць дамовы з насельніцтвам, якое брало на сябе пэўныя выдаткі на яе ўтрыманне, то пасля іх адмены і пераходу на фінансаванне ад аддзелаў народнай адукацыі становішча пагоршылася. Напрыканцы 1924 г. школа ўвогуле была зачынена з-за эпідэміі шкарлятыны [10]. Па

стане на 1927 г. Храпавіцкая латышская школа знаходзілая ў вёсцы Талынава (непадалёк ад Храпавічаў), выкладанне ў ёй вялося на латышскай мове. З 15 навучэнцамі ў школе працаваў 1 настаўнік [11].

Згортаванне новай эканамічнай палітыкі і пераход да фарсіраваных індустрыялізацыі і калектывізацыі пацягнулі за сабой вялікія сацыяльныя змены. Віцебская латышскае бюро к гэтаму часу пільна сачыла за жыццём латышскіх калоній. Да ўсіх значных (у тым ліку і Храпавічаў) былі прымацаваны адказныя таварышы. На запланаваны ў пачатку 1928 г. у Мінску Ўсебеларускі з'езд рабочых і сялян латышоў Храпавіцкая латкалонія павінна была вылучыць 1 дэлегата [12]. Вядома, што гэта павінен быў быць партыец. Аднак з'езд адбыўся толькі ў лістападзе 1929 г. На ім было прынята рашэнне аб суцэльнай калектывізацыі ўсіх латышскіх гаспадарак. Трэба разумець, што прынята яно было пад дыктоўку кампартыі, якая прыклала ўсе намаганні, каб на з'ездзе былі прадстаўлены лаяльныя ёй людзі. Як заўважалася ў паведамленні латвійскага консула ў Віцебску Г. Пунгі, большая частка ўдзельнікаў латышскага кангрэса не мела нічога супольнага з латышскім сялянствам, але выступала ад яго імя [13].

Гэтае рашэнне стала пачаткам канца Храпавіцкай латышскай калоніі. Латышы былі перакананыя ў правільнасці хутарской сістэмы і былі цалкам супраць калгасаў. Аналіз базы рэпрэсаваных міжнароднага таварыства "Мемарыял" паказвае, што толькі за студзень−сакавік 1930 г. у Храпавічах было арыштавана 5 гаспадароў (Гоба А.А., Гоба М.І., Зарын А.А., Калнін П.Ф., Подзін А.Я.) і яшчэ 2 у Талынава (Дзільно П.К., Зельцін А.І.). Калі браць за аснову агульную лічбу латышскіх гаспадарак (10), якую падаваў на 1928 г. К. Шкільтэр, то атрымоўваецца, што ад першай хвалі "раскулачвання" пацярпела больш за палову сямей. Калі храпавіцкіх латышоў на той момант саслалі ў лагеры, то вышэйназваных Дзільно П.К. і Зельціна А.І. прысудзілі да вышэйшай меры пакарання за антысавецкую дзейнасць.

У гэты ж час перастала дзейнічаць латышская школа.

Наступнае "выняцце ненадзейнага элемента" з Храпавічаў адбылося ў лютым 1934 г. У выніку (зноў такі па дадзеным МТ "Мемарыял") да 1937 г. тут з латышоў засталося толькі некалькі жанчын, але і іх прыбраў махавік рэпрэсій 1937−1938 г.

Такім чынам, амаль 150 гадоў таму на тэрыторыю сучаснага Мазалаўскага сельсавета прыехалі латышы, якія выкупілі зямлю і зрабілі хутарскія гаспадаркі. Прынесеныя імі метады вядзення сельскагаспадарчай справы паступова засвайваліся і беларусамі, што станоўча адбілася на выніках працы. Яшчэ да 1917 г. было ўтворана латышскае

культурна-асветніцкае таварыства, драматычная студыя якога ставіла тэатральныя пастаноўкі для жыхароў наваколля. У 1920-я гг. працавала латышская школа. Аднак з нарастаннем таталітарных тэндэнцый у грамадстве лад жыцця ў Храпавічах змяніўся. Спачатку перастала дзейнічаць культурна-асветніцкае таварыства. З пераходам да суцэльнай калектывізацыі пачаліся высылкі нязгодных (усіх такіх залічвалі да кулакоў). У выніку к канцу 1930-х гг. этнічных латышоў у Храпавічах амаль не засталося. Сёння аб былой іх тут прысутнасці сведчаць толькі дрэвы, могілкі непадалёк ад даўно ўжо нежылой в. Талынава і рэшткі гаспадарчых пабудоў, якія дзе-нідзе трапляюцца ў гэтых мясцінах. Яны перажылі заняпад, вайну і нават тую дзяржаву, якая знішчыла іх гаспадароў, і сёння сведчаць аб тым, наколькі трывала меркавалі латышы звязаць свой лёс з беларускай зямлёй.



*Сучаны стан вёскі Храпавічы (злева)*

*Рэшткі гаспадарчых пабудоў (знізу)*





**Выкарыстаныя крыніцы:**


1. Кикутс, Т. Переселение латышских крестьян в Витебскую, Могилёвскую и Минскую губернии во второй половине XIX века (сравнительный аспект) / Т. Кикутс // Латыши и белорусы: вместе сквозь века : сб. науч. ст. – Минск: РИВШ, 2012. – С. 4.

2. Шкільтэр, К. Латышскія калоніі на Беларусі : Гіст. развіццё латыш. сялян. гасп-к / Бел. акад. навук. Латыш. сектар. − Мінск, 1931.

3. Ķikuts, T. Latviešu zemnieku koloniju izveidošanās Krievijas impērijas Eiropas daļā (19. gs. 40. gadi – 1914. gads) / Promocijas darbs vēstures doktora zinātniskā grāda iegūšanai. − Rīga, 2015. − 198. lpp.
4. Тугай, У.В. Дзе песні з Даўгавы гучалі / У.В. Тугай, А.В. Галавач. – Мінск: Полымя, 1992. – С. 57.
5. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці (ДАВВ). Ф. 10051. Воп. 1. Спр. 205. Арк. 14.
6. Яковлева, Г.Н. Клубы и культурно-просветительные кружки латышского населения Витебщины в первое десятилетие советской власти / Г.Н. Яковлева // Искусство и культура. – 2012. − № 1(5). – С. 59−68.
7. ДАВВ. Ф. 246. Воп. 1. Спр. 103. Арк. 1−4.
8. Кикутс, Т. Грамотность в латышских колониях в белорусских губерниях (по данным Всероссийской переписи населения 1897 года) / Т. Кикутс // Латыши и белорусы: вместе сквозь века : сб. науч. ст. Вып. 2 – Минск: РИВШ, 2014. – С. 32.
9. ДАВВ. Ф. 221. Воп. 1. Спр. 53. Арк. 1−6.
10. ДАВВ. Ф. 10051. Воп. 1. Спр. 205. Арк. 20.
11. ДАВВ. Ф. 478. Воп. 1. Спр. 27. Арк. 1−12.
12. ДАВВ. Ф. 118. Воп. 1. Спр. 482. Арк. 8.
13. Архіў Гувераўскага інстытута Стэнфардскага ўніверсітэта (Hoover Institute Archives). Пасольства ў Стакгольме, бокс 1.